

# "ПРАЛЕСКА"

## Праграма выхавання і навучання ў яслях-садзе

*(Заканчэнне. Пачатак у №№ 4, 5, 6)*

## ХАРАКТАРЫСТЫКА ПСІХІЧНАГА І ФІЗІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ ДЗЯЦЕЙ ГРУПЫ "ФАНТАЗЁРЫ" (6-7 гадоў жыцця)



***Татульку, я хачу чытаць;***
***Татульку, хачу свет пазнаць;***
***Татульку, ехаць хачу праз моры;***
***Татульку, пабачыць хачу горы.***

**Цётка**

Вось і яшчэ некалькі крокаў па ўзроставай лесвіцы зрабілі вашы выхаванцы. Ці змяніліся яны? Усё часцей яны ўражваюць нас сваімі выдумкамі, адкрыццямі, пытаннямі. Іх фантазія, здаецца, невычэрпная. Нам усё цікавей са сваімі выхаванцамі. Зносіны з імі абвастраюць нашу назіральнасць, даюць магчымасць паглядзець на звычайныя прадметы і з'явы з новага боку.

"Паэт — гэта такі чалавек, які вельмі радуецца і вельмі засмучаецца, лёгка адчувае, хвалюецца і спачувае. І дзеці такія. А філосаф — гэта такі чалавек, які глыбока ўдумваецца і абавязкова жадае ведаць, як усё ёсць на самой справе. І зноў — дзеці такія...", — пісаў вядомы ўрач і педагог Я. Корчак. "Паэты і філосафы" — гэтыя азначэнні больш за ўсё падыходзяць нашым фантазёрам.

Фантазёры — самыя старэйшыя ў дзіцячым садзе, і гэта лёгка заўважыць — дзеці выцягнуліся, ёсць змены ў рысах дзіцячага твару, адбываецца замена зубоў, істотна змяніліся прапорцыі цела. Да канца знаходжання ў дзіцячым садзе дзіця ператвараецца ў даволі прапарцыянальна складзенага чалавека. Гэта натуральна — ідзе актыўная анатама-фізіялагічная будова, сталенне ўсяго арганізма, інтэнсіўна развіваюцца ўсе жыццёва важныя сістэмы. Функцыянальныя асаблівасці дзіцячага арганізма канчаткова яшчэ не скла́ліся. Прадаўжае нарастаць мускулатура як верхніх, так і ніжніх канечнасцей. Адносна добра ў гэты перыяд развіваюцца буйныя мышцы тулава і канечнасцей, чаго нельга сказаць аб дробнай маскулатуры рук, кісці. І гэта — адна з прычын скаргаў дзіцяці ("баліць рука"), якія можна пачуць ад яго пры замалёўцы вялікай прасторы на паперы. Удасканальваецца таксама сардэчна-сасудзістая сістэма дашкольніка.

**Узрастаюць фізічная і разумовая працаздольнасць дзіцячага арганізма**. Адбываюцца змяненні і ў органах унутранай сакрэцыі. З актывізацыяй працы шчытападобнай залозы звязваюцца ў значнай ступені характэрныя для гэтага перыяду эмацыянальная няўстойлівасць і хуткая змена настрою.

У гэтым узросце адбываецца змяненне залежнасці рухальнай актыўнасці і фізічнай падрыхтаванасці дзяцей ад іх фізічнага развіцця. Дзецям дадзенага ўзросту становяцца даступнымі, апроч асноўных і спартыўных відаў рухаў (хадзьба, бег, лажанне, скачкі, хадзьба на лыжах, язда на веласіпедзе, плаванне), элементы такіх спартыўных гульняў як бадмінтон, баскетбол, хакей, футбол, ручны мяч, гарадкі і іншых гульняў, якія прадугледжваюць больш высокі ўзровень фізічнага развіцця і здольнасць самарэгуляваць рухальную актыўнасць.

Хадзьба і бег дзіцяці па асноўных параметрах (даўжыня кроку, працягласць палёту пры бегу, яго частата) ужо набліжаюцца да паказчыкаў дарослых. Нашы выхаванцы шырока выкарыстоўваюць перакрыжаваную каардынацыю рук і ног. Прадаўжаюць у гэты перыяд актыўна развівацца рухальныя здольнасці — хуткасць, лоўкасць, гібкасць, вынослівасць, сіла. Прыкметней, чым у малодшых групах, праяўляецца выбіральнасць рухаў у залежнасці ад полу дзіцяці. Хлопчыкі часцей за ўсё аддаюць перавагу бегу, лажанню, скачкам, футболу, баскетболу. Іх поспехі тут больш прыкметныя, чым у дзяўчынак, якія больш паспяхова выконваюць рухі, дзе неабходныя пластыка, гібкасць, элементы рытмічнай гімнастыкі.

Немалаважную ролю ва ўдасканаленні рухаў дзіцяці, яго паводзін у цэлым адыгрывае развіццё яго цэнтральнай нервовай сістэмы. На гэтым этапе адбываюцца важнейшыя змяненні ў развіцці мозгу, ідзе складаная перабудова мазгавой актыўнасці, што адбіваецца на псіхічных функцыях — на розных эмацыянальных і складаных пазнавальных працэсах, на змяненні дынамікі зрокавых патэнцыялаў пры сканцэнтраванні ўвагі, рашэнні арыфметычных задач, адгадванні загадак і да т.п. У гэты перыяд ужо абазначаецца міжпаўшарная асіметрыя, прычым, у дзяўчынак хутчэй развіваюцца функцыі левага паўшар'я, адказнага, у прыватнасці, за ўспрыманне і аналіз мовы чалавека; у хлопчыкаў — правага, звязанага з адрозніваннем шумоў, іншых гукаў, інтуітыўным мысленнем. Разам з тым — ідзе інтэнсіўны працэс паспявання нервовых валокнаў, якія звязваюць кару паўшар'я, што забяспечвае іх узаемадзеянне. Гэта вельмі важна для навучання. Інтэнсіўнасць крованапаўнення мозгу набліжаецца да параметраў дарослых людзей. Усё гэта сведчыць аб вялікім псіха-фізіялагічным патэнцыяле фантазёраў, аб іх унікальных магчымасцях.

Функцыянальныя магчымасці арганізма ствараюць фундамент для ўмацавання іх здароўя (у параўнанні з малятамі і чамучкамі). У дзяцей з'яўляецца жаданне быць здаровымі, засмучэнне ад частых і працяглых хвароб, якія могуць стаць прычынай комплексу непаўнацэннасці.

Такім чынам, нашы выхаванцы змяніліся. Але не толькі знешне, фізічна. У гэты перыяд **адбываюцца глыбокія псіхічныя перамены**. Звязаны яны не толькі з функцыянальнай перабудовай арганізма, яго сталеннем. Змяняецца ж і сацыяльнае становішча дзіцяці. Нашы выхаванцы старэйшыя ў дзіцячым садзе, хутка яны пойдуць у школу, аб якой ужо зараз марадь (асабліва старэйшыя фантазёры). Дзяцей па-ранейшаму прыцягвае свет дарослых, разам з тым яны пачынаюць разумець, што сапраўдны шлях да яго ляжыць праз школу. Шасцігадовы ўзрост — гэта той перыяд, калі **фарміруецца псіхалагічная гатоўнасць да навучання ў школе** (інтэлектуальная, сацыяльна-асобасная, валявая). Крызіс сямі гадоў яшчэ наперадзе. Зараз жа дзіця яшчэ дашкольнік і да канца знаходжання ў вашай групе яшчэ будзе дашкольнікам, хоць і старэйшым. Таму ўспрымем як нармальную з'яву полімагываванасць фантазёраў, звязаную з паступленнем у школу. Іх цягне ў школу не толькі жаданне вучыцца, але і новыя абставіны, новае становішча ў жыцці, валоданне аксесуарамі, звязанымі з школьным жыццём ("У мяне будзе новы партфель!" і г.д.). Галоўнае зараз — каб яны хацелі ступіць на гэтую новую прыступку і не баяліся яе; каб іх чаканні, звязаныя з паступленнем у школу, будаваліся на спрыяльным эмацыянальным фоне.

Мы заўважым, як разам з узнікненнем імкнення да школы і вучобы будуць змяняцца паводзіны нашых выхаванцаў. Іх будуць прыцягваць не толькі спецыфічна дашкольныя віды дзейнасці (гульня, маляванне і інш.), усё часцей, асабліва ў самых старэйшых фантазёраў, будзе ўзнікаць жаданне заняцца "сур'ёзнай" справай, выконваць "адказныя" даручэнні, заняткі навучальнага характару. Нават гуляючы ў школу, усё часцей дзеці пачынаюць узнаўляць гэтыя "сур'ёзныя" справы — урокі пісьма, чытання пачынаюць "выцясняць" не толькі церапінкі, але ўрокі малявання, фізкультуры...

Але ж вядучай для вашых выхаванцаў застаецца гульнявая

дзейнасць. Фантазёры любяць гуляць, але іх гульні адрозніваюцца ад гульняў чамучак і тым болей малят. У пяці-шасцігадовых дзяцей можна назіраць не толькі гульні на бытавы сюжэт (дочкі-маці і да т.п.), у гэтым узросце дасягаюць свайго росквіту гульні на творчыя сюжэты, атрымліваюць развіццё таксама гульні з шырокім грамадскім сюжэтам. Галоўны змест гульняў фантазёраў — гэта не столькі дзеянні з прадметамі, колькі зносіны паміж людзьмі. Менавіта з-за роляў і правілаў гульні часцей за ўсё ўзнікаюць дзіцячыя канфлікты. Павялічваецца састаў удзельнікаў ролевых гульняў, значна ўзрастае працягласць існавання гульнявых аб'яднанняў. Яшчэ да пачатку гульні дзеці папярэдне яе плануюць, размяркоўваюць ролі, адбіраюць неабходныя цацкі, іншыя прадметы, а ў ходзе гульні паступова кантралююць дзеянні адзін аднаго, крытыкуюць, падказваюць, як павінен паводзіць сябе той ці іншы персанаж (чаго не назіралася раней). Калі прыгледзецца і прыслухацца да гуляючых дзяцей, то можна заўважыць некалькі тыпаў узаемаадносін — стабільныя, міжасобасныя (узнікаючыя да пачатку гульні), сюжэтна-ролевыя (абумоўленыя сюжэтам і зместам гульні), арганізацыйна-дзелавыя.

Вялікае месца ў жыцці вашых выхаванцаў займаюць і гульні з правіламі (рухомыя, дыдактычныя, рэжысёрскія, гульні-драматызацыі). Развіваецца і мастацкая дзейнасць дашкольнікаў — выяўленчая, музычная, канструктыўная, мастацка-моўная. У ёй праяўляюцца і актыўна фарміруюцца мастацкія здольнасці дзяцей, і разам з тым — ідзе далучэнне іх да агульначалавечай і нацыянальнай культуры, развіваецца пачуццё самакаштоўнасці фантазёраў.

Імкнучыся дакапацца да ісціны, атрымаць адказ на хвалюючыя пытанні, вашы выхаванцы ўсё часцей уключаюцца ў эксперыментаванне, даследніцтва. Развіваецца і працоўная дзейнасць дзяцей. Вашы гадаванцы ўжо не толькі займаюцца самаабслугоўваннем, але ўсё часцей становяцца рэальнымі памочнікамі ў вашай працы (разам садзяць расліны, збіраюць ураджай і г.д.).

Важнай асаблівасцю старэйшых дашкольнікаў з'яўляецца новая для іх дзейнасць — вучэбная. Яны гатовы навучацца па праграме дарослага, імкнуцца слухаць і чуць педагога, вылучаць вучэбную задачу і ператвараць яе ў самастойную мэту дзейнасці і г.д. Гэтыя праяўленні яскрава заўважаюцца ў вашых выхаванцаў, але ступень іх праяўлення можа быць рознай — шмат што залежыць ад гатоўнасці канкрэтнага дзіцяці да новай сацыяльнай пазіцыі — пазіцыі школьніка.

Важную ролю ў псіхічным развіцці вашых выхаванцаў адыгрываюць узаемаадносіны з дарослымі. Праяўленне ўвагі, дзелавое супрацоўніцтва па-ранейшаму важна для іх. Аднак усё большае значэнне набываюць пазасітуатыўна-пазнавальныя адносіны. Патрэбнасць у суперажыванні, увазе з боку дарослых дзіця задавальняе ў новай форме зносін — пазасітуатыўна-асобаснай. Дзіцяці ўсё цікавей становяцца размовы аб акружаючых яго людзях, героях літаратурных твораў, фільмаў, безумоўна — аб самім сабе. У такіх гутарках не толькі пашыраюцца і паглыбляюцца ўяўленні дзяцей, але, што вельмі важна, актыўна фарміруецца іх камунікатыўная гатоўнасць да школы, да ўзаемадзеяння з будучым настаўнікам.

Не знікае патрэбнасць фантазёраў і да зносін з равеснікамі. Іх супрацоўніцтва носіць дзелавы, практычны характар. Яно прыкметна адрозніваецца ад супрацоўніцтва чамучак, г. зн. уключае падпарадкаванне не толькі ролям, але і правілам. Зместам зносін становяцца не толькі эпізоды канкрэтных сітуацый, але і абагульненыя ўяўленні дзяцей.

У аб'яднаннях дзяцей усё выразней праяўляецца такі феномен, як грамадская думка наконт тых або іншых аспектаў узаемадзеяння ў гульні, карыснай працы, вучобе. Дзіця вучыцца ўзгадняць свае жаданні з раўнагодкамі, суадносіць іх з групавымі і ў той жа час абараняць уласныя інтарэсы. Так развіваюцца ўменні сумеснага планавання, фарміруюцца адносіны ўзаемнай адказнасці і дапамогі.

Важныя змяненні адбываюцца і ў структуры самасвядомасці старэйшага дашкольніка. Развіваецца ўсведамленне свайго сацыяльнага "Я". Дзіця становіцца больш чулым да сістэмы міжасобасных адносін, узнікаючых як у сям'і, так і ў дзіцячым садзе, усё часцей і з больш узрастаючым інтарэсам параўноўвае сябе з раўнагодкамі, яно ўжо можа адрозніваць асобасныя якасці іншых і самога сябе і даць ім ацэнку. У ацэнках дамінуе тэндэнцыя ў дадатны бок. Пры гэтым ацэначныя статусы дзяўчынак вышэй, чым у хлопчыкаў. З'яўляецца самакрытычнасць, якая ў шэрагу выпадкаў можа адыграць важную ролю ў развіцці імкнення да самаўдасканалення.

Вашы выхаванцы ўжо здольныя даволі адэкватна ўявіць структуру сваёй асобы. Яны не толькі добра ведаюць аб сваёй прыналежнасці да мужчынскага або жаночага полу, але і разумеюць ужо, што гэта назаўсёды, незваротна, і імкнуцца самасцвердзіцца як прадстаўнікі канкрэтнага полу. Актыўна развіваецца ўсведамленне сябе ў часе. Дзеці памятаюць сябе ў мінулым і ўяўляюць у будучым ("Я буду школьнікам", "Я буду хадзіць у басейн і навучуся плаваць", "Я не ўмеў раней маляваць" і г.д.).

Калі мы прыгледзімся да нашых выхаванцаў, то заўважым, што яны па-рознаму паводзяць сябе з акружаючымі, адчуваюць магчымую рэакцыю на свае паводзіны ці канкрэтны ўчынак — гэта значыць, што яны здольны да рэфлексіі. У працэсе сумеснай дзейнасці дзіця навучаецца ставіць сябе на месца таго ці іншага чалавека, у яго развіваецца гатоўнасць суперажываць — эмпатыя. Наогул, узаемаадносіны старэйшага дашкольніка з людзьмі (як дарослымі, так і равеснікамі) — найбольш моцная і важная крыніца яго перажыванняў.

Шмат хто з вашых выхаванцаў мае ўжо даволі ўстойлівыя сімпатыі сярод равеснікаў, і іх перавагі грунтуюцца ў асноўным на матывах дружбы. Дзеці здольны ўжо раскрыць змест сваёй дружбы, спрабуюць асэнсаваць сяброўскія адносіны. І разам з тым старэйшыя дашкольнікі адчуваюць дыскамфортнасць, няўпэўненасць у сабе, калі адбываецца дэпрывацыя іх патрэбнасцей у зносінах, калі яны апынаюцца ў становішчы "рабінзонаў", "непрынятых" у групе равеснікаў.

На аснове пачуцця даверу да людзей, імкнення адпавядаць патрабаванням дарослых узнікае такое маральнае пачуццё, як сумленне. У працэсе ўзаемадзеяння з акружаючымі атрымліваюць сваё далейшае развіццё і такія пачуцці, як гордасць, сарамлівасць. Фантазёры могуць ганарыцца не толькі канкрэтнымі ўчынкамі, ухваленымі дарослым, але і сваімі дадатнымі якасцямі, уменнямі, якія яны самі ўсведамляюць. Развіваюцца ў старэйшых дашкольнікаў і іншыя пачуцці, такія як маральныя, эстэтычныя, інтэлектуальныя. Пачуцці ўсё часцей становяцца матывам паводзін дзяцей.

Сур'ёзныя змяненні церпіць і матывацыйная сфера фантазёраў. Разам з матывамі, звязанымі з імкненнем быць падобным на дарослых, больш пабуджальную сілу набываюць пазнавальныя матывы, імкненне да самасцвярджэння, спаборніцтва, жаданне захаваць добрыя ўзаемаадносіны з равеснікамі, палепшыць сваё становішча сярод іх.

Не толькі новыя матывы паводзін характэрны для фантазёраў. Старэйшы дашкольнік ўжо здольны падпарадкоўваць іх. Гэта новаўтварэнне — адно з важнейшых у развіцці асобы ў дашкольным узросце (А. Н. Лявонцьеў). Яно дазваляе адмовіцца ад прыцягальнага ў гэты момант прадмета ці дзеяння дзеля выканання больш важнага, хоць магчыма, больш сумнага занятку. І тое, якія матывы выступаюць у якасці галоўных у канкрэтнага нашага выхаванца, вызначае накіраванасць усіх яго паводзін. Безумоўна, у шэсць гадоў гэты стрыжань толькі складваецца, але пэўную накіраванасць у паводзінах канкрэтнага выхаванца ўжо можна назіраць (стваральная, эгаістычная, спажывецкая, разбуральная).

Будзем жа ў сваім узаемадзеянні з дзецьмі пабуджаць каштоўныя для развіцця асобы матывы, абапірацца на іх. І не забудзем: мы у групе "фантазёраў". Творчае ўяўленне, што ляжыць у аснове творчасці, асабліва ярка праяўляецца ў старэйшым дашкольным узросце — у гульнях, малюнках, дзіцячых пабудовах, у створаных дзецьмі мелодыях, танцах, вершах... Творчая актыўнасць нашых выхаванцаў — у іх імкненні не прытрымлівацца гатовых узораў, штампаў, а шукаць уласныя арыгінальныя рашэнні, у выказванні сваіх асобых адносін да навакольнага як ужо вядомымі спосабамі, так і самастойна прыдуманымі...

Развіваецца ў нашых выхаванцаў і **валявая сфера.** Фарміруюцца асноўныя элементы валявога дзеяння: дзіця здольна само паставіць мэту, прыняць рашэнне, намеціць план, прыкласці намаганне для пераадолення цяжкасцей. На гэтым этапе развіцця істотна змяняецца ступень адвольнасці рухаў дзіцяці, узрастае ўменне кіраваць сваімі рухамі і дабівацца іх дакладнасці. Адвольнасць выразна праяўляецца ў рэгуляцыі паводзін і псіхічнай дзейнасці ў цэлым. Аднак варта падкрэсліць, што больш высокіх вынікаў у валявым дзеянні дзіця дасягае пры гульнявай матывацыі і пры дадатнай ацэнцы яго паводзін з боку равеснікаў і дарослых.

К шасці гадам у выхаванцаў фарміруецца даволі высокі ўзровень **пазнавальнай дзейнасці.** Вось асноўныя дасягненні шасцігодак у гэтай галіне:

— засвоена сістэма грамадска выпрацаваных сенсорных эталонаў, карыстаючыся якімі дзіця авалодвае некаторымі рацыянальнымі спосабамі абследавання ўласцівасцей прадметаў (разглядваннем, абмацваннем, прыслухоўваннем і да т.п.);

— шасцігодкам даступна разуменне агульных сувязей, прынцыпаў, заканамернасцей, якія ляжаць у аснове навуковых ведаў (веды аб узаемадзеянні арганізма і асяроддзя, аб залежнасці паміж формай прадмета і яго функцыяй, патрэбнасцямі і паводзінамі і да т.п.);

— дзіця валодае адносна вялікім аб'ёмам як стабільных ведаў аб навакольным свеце і аб сабе, так і ведамі гіпатэтычнымі, якія праяўляюцца ў здагадках, меркаваннях, пытаннях;

— важным вынікам інтэлектуальнага развіцця фантазёраў з'яўляецца дасягненне высокага ўзроўню вобразнага і наглядна-схематычнага мыслення, абапіраючыся на якое яны могуць вычляняць істотныя ўласцівасці і адносіны паміж прадметамі навакольнага свету, мадэліраваць іх, разумець і паспяхова выкарыстоўваць схематычныя адлюстраванні, ствараць новае і арыгінальнае (у гульні, вырабах, моўнай і музычнай творчасці, канструяванні і да т.п.). Шэраг праблем вырашаецца ўжо з дапамогай славесна-лагічнага паняційнага мыслення;

— адным з асноўных дасягненняў шасцігадовага дзіцяці і паказчыкам яго гатоўнасці да навучання ў школе з'яўляецца фарміраванне перадумоў да засваення знакавай функцыі, знакавых сістэм (авалоданне лічыльнымі аперацыямі, пераход да аперыравання лікам і знакам, гукавы аналіз слова, чытанне, авалоданне нотнымі знакамі і да т.п.);

— старэйшыя дашкольнікі авалодваюць уласна-мнемічнай дзейнасцю, у іх узнікае адвольная памяць.

Да канца дашкольнага ўзросту дзіця авалодвае і асобнымі прыёмамі лагічнага запамінання. Разам з тым — пераважае міжвольная памяць, лёгка запамінаецца і надоўга захоўваецца інфармацыя, што выклікала інтарэс. Прадуктыўнасць міжвольнага запамінання павялічваецца, калі заданне, прапануемае дзіцяці, прадугледжвае не проста пасіўнае ўспрыманне, а актыўную арыенціроўку ў матэрыяле, выкананне мысліцельных аперацый (прыдумванне, устанаўленне канкрэтных сувязей і г.д.).

Важным новаўтварэннем старэйшага дашкольнага ўзросту з'яўляецца і ўзнікненне адвольнай увагі, якая істотна уплывае на пазнавальную і эмацыянальную сферу дзіцяці.

У час зносін са сваімі выхаванцамі мы назіраем іх узаемадзеянне з наваколлем і, безумоўна, заўважаем, як змянілася іх мова. Нашы фантазёры да моманту паступлення ў школу практычна авалодваюць усімі бакамі роднай мовы — слоўнікам, гукавым складам, граматычным ладам. Больш таго, нашы выхаванцы пачынаюць усвядомлена адносіцца да мовы: у іх развіваецца фанетычны слых (здольнасць успрымаць на слых гукі мовы, адрозніваць і абагульняць іх у словах як асобныя адзінкі).

Старэйшыя дашкольнікі ўжываюць розныя формы мовы (сітуатыўную, кантэкстуальную, тлумачальную). Іх мова выконвае не толькі функцыю зносін, але і плануючую (унутраная мова). Другая сігнальная сістэма набывае ўсё больш значную ролю ў рэгуляванні (і самарэгуляванні) дзейнасцю дзяцей.

Шасцігадовае дзіця... Яно на пераходзе ад бесклапотнага дашкольнага дзяцінства да школьнага жыцця з яго няпростымі патрабаваннямі, абавязкамі... Гатоўнасць да школы, да навучання ў ёй — адзін з важных вынікаў псіхалагічнага развіцця ў дашкольны перыяд.

Яшчэ зусім нядаўна такія жвавыя, адкрытыя, у сем гадоў яны ўжо ўстаюць на новую ўзроставую прыступку, страчваюць непасрэднасць і сітуатыўнасць паводзін, набываюць здольнасць дзейнічаць пазасітуатыўна, у адпаведнасці са свабодна прынятай унутранай пазіцыяй школьніка. Фарміруецца адвольная рэгуляцыя паводзін, арыентацыя на сацыяльныя нормы і патрабаванні. Пакуль што яны яшчэ дашкольнікі. У гэтых сімпатычных, мілых нашаму сэрцу дзяўчынак і хлопчыкаў у гэты перыяд ёсць шмат агульнага. І разам з тым — у кожнага з іх за мінулыя гады назапасіўся, няхай не такі ўжо і вялікі, але свой жыццёвы вопыт, склалася асобнае ўяўленне аб свеце і сваім месцы ў ім; у кожнага — свае інтарэсы, здольнасці, тэмперамент, звычкі. Будзем жа імкнуцца да таго, каб у нашых выхаванцаў своечасова сфарміраваліся новаўтварэнні, якія б далі магчымасць упэўнена ступіць на новую ўзроставую ступень — малодшага школьніка. І разам з тым — дапаможам кожнаму з іх адчуць радасць быцця, самасцвердзіцца і выявіць сваю індывідуальнасць.

*Над раздзелам працавалі:*

*Г. М. БЕЛАУС, кандыдат псіхалагічных навук, дацэнт;*

*Я. Л. КАЛАМІНСКІ, доктар псіхалагічных навук, прафесар;*

*Л. А. ПАНЬКО, прафесар;*

*Л. У. ФІНКЕВІЧ, кандыдат псіхалагічных навук;*

*В. А. ШЫШКІНА, кандыдат педагагічных навук, дацэнт.*